# СОН У ВЯСЕЛЬНУЮ НОЧ

## З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

Цяпер, зводдалі пражытых гадоў, многае ў гэтай гісторыі здаецца па меншай меры неверагодным. І я, пэўна ж, не ўзяўся б за пяро, калі б не новая сустрэча з будчанскімі лесарубамі, маімі даўнімі і добрымі знаёмымі.

Яны палуднавалі на вузенькай — што зайцу скокнуць — прасецы. Елі нетаропка і смачна, як багі. Па-таварыску дзяліліся паміж сабой хто акрайцам хлеба, хто салёным агурком, цыбулінай ці нават салам — няхітрым вясковым пажыткам, які звычайна бярэцца з сабою ў лес.

Мы сядзелі трошкі наўзбоч, каля невялічкага цяпельца, і брыгадзір Максім Максімавіч Сініца расказваў мне аб новым метадзе работы на лесасеках.

— Ведаеш што, — тлумачыў ён, — спецыялізацыя ў брыгадзе ў час масавага павалу лесу вельмі ж прагрэсіўны метад. Патрэбны да зарэзу. Уяві сабе: выпрацоўка ў паўтара раза павялічваецца. Ты адно не пішы, што гэта я прыдумаў. Маёй заслугі тут аніякай. Гэта ўсё Міхалава заслуга.

— Якога Міхала? — пацікавіўся я.

— Дайліда. Шкада чалавека — зноў занядужаў штосьці, другі дзень на работу не выйшаў. Ён бы табе ўсё расклаў па палічках.

Гадзіны праз паўтары я ўжо сядзеў у вялікай хаце Міхала Тарасавіча Дайліда і піў разам з гаспадаром духмяны, настоены на брусьнічніку, чай. Гаворка наша, можна сказаць,была закончана, заставалася адно падзякаваць гаспадару і адпраўляцца ў зваротны шлях, як нечакана ўсхапіўся такі шалёны вецер — дахі дамоў зарыпелі, бы рассохлыя масніцы, і тут жа хлынуў, як з вядра, першы вясновы дождж. Быў якраз канец сакавіка — пара сухадолу і цішы, — а тут на табе — носа на вуліцу не высунуць. Вецер не сунімаўся да самага вечара, і на змярку гравійка

на райцэнтр ужо больш нагадвала ручай, чым дарогу. Спадзявацца на спадарожную машыну (рэйсавыя аўтобусы тут яшчэ не ходзяць) не мела сэнсу, і таму нечакана для мяне самога з языка зляцела:

— У дырэктара школы пераначую. Даўно запрашаў наведацца.

Міхал Тарасавіч пакрыўдзіўся:

— У мяне таксама месца не бракуе. Ды і весялей удвух.

— А вы што — жывяце адны?

— Ну, адзін не адзін, жыву вось, як бачыце... Заставайцеся ў мяне. Душу будзе з кім адвесці...

Прадвеснем, як і ўвосень, змяркаецца ранавата, і я, шчыра прызнаюся, пашкадаваў, што і на гэты раз адправіўся "на перакладных", зноў мушу марна траціць доўгі вечар: не станеш жа пры чужым чалавеку даводзіць да ладу свае дзённыя запісы. Тым часам дождж аціх, і на двары як быццам пасвятлела. Толькі вецер па-ранейшаму шалёна выў у коміне, гойсаў па гарышчы, грукацеў філёнчатымі дзвярмі веранды. Мне нават падалося, быццам хтосьці нішкам ходзіць вакол хаты, знарок спыняецца ля высокіх вокан Міхалавай пяцісценкі і чуйна слухае, што тут робіцца. Я нават хацеў было сказаць аб гэтым, але гаспадар, мужчына ў гадах, разважны і надзіва спакойны, не зважаў ні на якія шолахі. Ён зябка хутаўся ў цёплы заечы кажушок і ўвесь час піў свой адмысловы чай.

Не ведаю, што яму прыйшло ў галаву, але нечакана ён крута павярнуўся да мяне і спытаў:

— Вам спаць не вельмі хочацца?

— Ды не, не вельмі. А што?

— Раскажу пра сваё жыццё. Не пярэчыце?..

І мы прагаманілі далёка за поўнач.

...У войску служыць яму амаль не давялося. Прызывалі navабранцаў у хуткім часе пасля вайны, а паўгода спагадзя да слыху вяскоўцаў дайшла страшная чутка: на тактычных занятках Тарасаў Міхалка (так яго ўсе звалі ў Будчы змалку) трапіў у аўтамабільную аварыю і цяпер, пакалечаны, ляжыць у шпіталі. Стаяў ён недзе пад Лепелем — свет няблізкі адсюль, і маці, уволю наплакаўшыся, калі прыйшоў час, падалася ў той далёкі шпіталь, каб дапамагчы свайму адзінаму сыну прыехаць дамоў.

У вёсцы мала хто ведаў, што ў тыя дні ўбівалася не адна Тарасіха. Дужа плакала, нават, казалі, гатова была рукі на сябе налажыць Аўгінніна дачка Кацярынка. Каця лічылася лепшай дзяўчынай на ўсю вёску, і ёй, сапраўды, ад жаніхоў-ухажораў адбою не было. Але ж адшывала яна ўсіх падрад, бо чакала свайго Міхала, сваё першае і, як яна не раз пісала яму, апошняе каханне.

І раптам такое няшчасце. Такое гора. Цэлы дзень, калі Тарасіха прывезла сына дадому, дзверы хаты амаль што не зачыняліся: усё ішлі і ішлі вяскоўцы. Бадай што першай прыбегла Аўгіння. Пастаяла ў парозе і непрыкметна пайшла. Дома яна накінулася на дачку:

— Кінь плакаць, дурніца, і выкінь яго з галавы. Паўгода не працягне, як богу душу аддасць.

Міналі тыдні, месяцы. Уся вёска чакала добрых вестак з Тарасіхінай хаты, а іх усё не было і не было. Папаўзла чутка, што хворы ўжо ніколі па-сапраўднаму не ўстане на ногі, бо ў яго пашкоджаны пазваночнік, і што, на вялікі жаль, песня яго — спетая.

Шкадавалі вяскоўцы Міхала. І шкадавалі па-чалавечы шчыра. Хіба ж можна было заставацца раўнадушным, калі чалавек на дзевятнаццатай вясне становіцца калекам і пенсіянерам. Але не менш шкадавалі і Тарасіху, жанчыну сціплую і сардэчную, якая за ўсё сваё жыццё вады нікому не замуціла. Аўдавела Тарасіха яшчэ задоўга да вайны, на руках засталося трое немаўлят. Усяго зведала, пакуль падняла дзяцей. Дзве старэйшыя дочкі-блізняты пайшлі замуж у суседнюю вёску, і пайшлі няўдала — за п'яніц і забіякаў, і таму ўся надзея была цяпер на Міхала, адзінага і нічым не заменнага — як тое вока ў ілбе.

Бедавала Тарасіха, але не менш бедаваў і сам Міхал. Калі маці бегла на ферму — яна рабіла даяркай у калгасе, сын асцярожна злазіў з ложка, што стаяў ля самага акна (каб лепей бачыць вуліцу), і пачынаў упарта вучыцца хадзіць. Рабіў колькі крокаў узад-уперад і спыняўся, бо ад болю цямнела ўваччу і зусім не слухаліся ногі. Іншы раз ён падаў пасярод хаты, траціў прытомнасць, а калі прыходзіў у сябе, паўзком дабіраўся да ложка, з цяжкасцю ўзлазіў на яго і тады ўжо з тыдзень часу баяўся паўтараць свае ўрокі.

Чаго толькі не передумаў Міхал за доўгія і змрочныя дні, за яшчэ больш даўжэйшыя і роспачна-трывожныя ночы сваёй хваробы! Ніхто не ведаў, ніхто не знаў аб гэтым. Найлепшае з прысмакаў, што некалі ў дзяцінстве, як гаварыла маці, няжованае ляцела,цяпер колам перасядала ў горле. "Што рабіць?" Сёстры наведаліся да брата, пасядзелі, паскуголілі і — за дзверы. Свае сем'і — свой клопат. Заходзяць сябры, таксама пасядзяць, пагавораць і — бывай здароў. У кожнага свае пільныя, свае неадкладныя справы.

Толькі маці — святы чалавек! — заўсёды застаецца сабою. Каб прымела, усё б аддала, усю сябе без рэшты, адно толькі каб ачуняў, каб, як некалі, лёгка прайшоўся вуліцай, закружыўся ў танцы, разам з касцамі адправіўся на поплаў ці з лесарубамі ў лес. Толькі б жыў, паправіўся. Яна сваё аджыла, з яе хопіць.

Згадвала, як у вайну, у блакаду, ратавала сына ў лесе ад фашыстаў, не сябе — яго ратавала; як пасля вызвалення настаўляла на правільную дарогу — "вучыся, сынок, старайся". Перарасткам быў, але ж паслухаўся маці, пайшоў у школу. І скончыў-такі сем класаў.

Аднаго баялася Тарасіха: згадваць пры сыне пра Кацярынку. Маці ведала, што Кацярынка так ні разу і не зайшла да іх, не бачыла яшчэ Міхала пасля прыезду дамоў. І не таму, што сама не хоча — не, Аўгіння не пускае. Ды і на Аўгінню ў яе не было злосці. Якая маці хоча благога свайму дзіцяці. Калі шчыра, Тарасіха і не хацела, каб Кацярынка заходзіла да іх: навошта развярэджваць душу хвораму чалавеку?

І ўсё ж Кацярынка зайшла. Улучыла хвілінку, калі старой не было дома, ціхенька адчыніла дзверы. Міхал нават не чуў, як яна пераступіла парог.

— Добры дзень, Міша, — ледзь чутна прашаптала Кацярынка і застыла ў чаканні: што ён скажа?

Міхал спачатку разгубіўся,у яго перасохла ў горле, а калі авалодаў сабою, сказаў, наколькі мог, спакойна:

— Праходзь, Кацярынка, садзіся. Як добра, што ты зайшла.Я часта бачу цябе ў акне, калі ты ідзеш па вуліцы. Раз хацеў паклікаць нават... Ды ты садзіся, садзіся...

Але яна не села. Упала на калені каля ложка, злавіла яго халодную, як лёд, руку, прытуліла яе да вуснаў і залілася слязьмі.

У той раз ён сказаў ёй усё, што хацеў:

— Не пара я цяпер табе. І ты, калі ласка, не хадзі больш каля нашых вокан. Я ведаю, што да цябе заляцаецца Навумаў Мікіта. Рабі, як знаеш. Ён нішто хлопец. Адно фанабэрысты вельмі. Глядзі, каб горшы не стаў. А я — не пара...

Праз колькі месяцаў, пасля жніва, Аўгіння спраўляла вяселле. Угаварыў-такі фанабэрысты Мікіта, улагодзіў Кацярынку. На вяселлі гуляла ўся вёска. Нават Тарасіху запрашалі: раднёй нейкай аказалася Навумавым. Якая там радня — дзесятая вада на кісялі. Не пайшла яна ні на вяселле, нікуды з хаты.

Міхалу ў той дзень прысніўся дзіўны сон.Быццам зноў зайшла да іх Кацярынка і знарок скінула яго з ложка. Ён так балюча грымнуўся аб падлогу, што закрычаў у сне і тут жа прачнуўся. Зірнуў у вакно. Над вёскай вісела ціхая летняя ноч. На тым канцы, дзе жыла Кацярынка, яшчэ бухалі ў бубен, але самой музыкі не было чуваць. Міхал звесіў ногі з ложка і на ўсю моц стукнуў імі аб падлогу. Здзівіўся: ён не адчуў болю ні ў нагах, ні ў пазваночніку. Усё ў ім — як акамянела. Тады ён, прытрымліваючыся рукамі за ложак, пачаў хадзіць. Асмялеўшы, адштурхнуўся ад ложка. Прайшоў па пакоі раз. Потым другі. Трэці. Пасля, у адных спадніках, выйшаў на двор. Пастаяў. Аддыхаўся. Пахадзіў па двары, а затым скіраваў на агарод. Адсюль была відна Аўгінніна хата, асабліва яе сад — вялікі, адзіны на ўсю вёску. Цяпер ён быў асветлены мо дзесяткам электрычных лямпачак: там гулялі вяселле. Міхал упіўся ў гэтае святло вачыма і не заўважыў, што побач з ім стаіць маці.

— Сыночак, любы мой, —заплакала яна. — Я знала, я верыла, што ты паправішся.

І ён сапраўды паправіўся. Праўда, не было ў ім пакуль што ранейшага спрыту, але ажываў чалавек на вачах...